Што вы ведаеце пра ліпу? Чым гэта дрэва карыснае для чалавека? Падбярыце з тэксту словы, аднакаранёвыя да слова *ліпа*.

Ці з'яўляюцца роднаснымі словы *ліпавы* і *ліпкі*? Абгрунтуйце сваю думку.

• Знайдзіце ў тэксце словы, у якіх пры змяненні назіраюцца чаргаванні галосных гукаў.

Зрабіце вусны і графічны разбор па саставе выдзеленых слоў.

## § 16. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны (паўтарэнне)

**95.** Прачытайце. Чаму тэкст мае такую назву? На колькі сэнсавых частак яго можна падзяліць?

### Чорнае золата

Чорным золатам называюць нафту. **Бяскрайнія** і **бяздонныя** зямныя кладоўкі служаць для яе сховішчам. Нафту трэба толькі **адшукаць**, **падняць** на паверхню і ўмела выкарыстаць.

У 1965 годзе беларуская зямля **раскрыла** свае тайны. У рэчыцкіх нетрах геолагі[л] **адкрылі** нафту. Пачалася яе прамысловая **здабыча** *(Паводле У. Ліпскага)*.

[б'ас]крайнія
[б'аз]донныя
[ат]шукаць
[пад]няць
[рас]крыла
[ат]крылі
[з]дабыча

Параўнайце вымаўленне і напісанне прыставак у выдзеленых словах. Ад чаго залежыць напісанне прыставак на зычны?

Прыстаўкі, якія заканчваюцца на ***б*** і ***д***, пішуцца нязменна: *падняць*, *падход*, *абступіць*, *абвестка*.

Напісанне прыставак на ***з*** і ***с*** залежыць ад першага зычнага гука кораня: *разведаць*, *расклад*, *бяззорны*, *бясконца*.

**96.** Да прапанаваных слоў падбярыце аднакаранёвыя з прыстаўкамі ***аб-***, ***ад-***, ***пад-***. Прыстаўкі і карані выдзеліце.

Узор: *бегчы* — *аббегчы*, *адбегчы*, *падбегчы*.

Ставіць, гарэць, мокнуць.



Правообладатель Национальный институт образования

**97.** Прачытайце схему. Растлумачце, як праверыць напісанне літары ў прыстаўках на зычны.

Якая літара пішацца ў прыстаўцы на зычны?

↓

Вызначы прыстаўку і корань у слове

| ↓ | ↓ |
| --- | --- |
| Першы гук кораня звонкі зычны | Першы гук кораня глухі зычны |
| ↓ | ↓ |
| Пішы ***з*** | Пішы ***с*** |

**98.** Карыстаючыся ўзорам, замяніце спалучэнні слоў словазлучэннямі «прыметнік + назоўнік». Запішыце іх. Растлумачце правапіс прыставак у словах.

Узор: *ноч без сну — бяссонная ноч.*

Птушка без крылаў — ..., пасажыр без білета — ..., алень без рог — ..., хлопчык без сораму — ..., чалавек без голасу — ..., неба без зор — ..., возера без дна — ... .

Як называецца птушка без крылаў? Дзе яна жыве?

**99.** Прачытайце загадку, устаўляючы замест пропускаў утвораныя прыметнікі з практыкавання 98. Якія прыметы дапамаглі вам адгадаць, пра каго гаворыцца ў тэксце?

Хоць ..., а лятае,
... — свішча,
Хоць бязрукі[с], а, бывае,
Грушы ў садзе абівае,
Нават часам вырывае
Дрэва з каранішчам.
А як зморыцца — упадзе,
І няма яго нідзе.

*Н. Гілевіч.*



З апошняга сказа выпішыце слова з арфаграмай, напісанне якой адпавядае правілу «Правапіс прыставак на зычны».

Падбярыце аднакаранёвыя словы да слова *каранішча*.

Разгледзьце малюнак. Раскажыце, як сёння чалавек выкарыстоўвае энергію ветру.



Правообладатель Национальный институт образования

**100.** Прачытайце скорагаворкі М. Пазнякова. Запішыце іх, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце прыстаўкі. Растлумачце напісанне арфаграм.

У гародчыку[с] чаромха ра..цвіла,
Пчоламі чаромха загула[с].

Галаваломку ра..гадвае Ромка,
Толькі няпростая галаваломка.

- Складзіце схему першага сказа.

**101.** Размяркуйце па групах словы з прыстаўкамі ***раз-*** і ***рас-***. Растлумачце напісанне прыставак. З трыма словамі складзіце сказы.

Ра*(?)*круціць, ра*(?)*вязаць, ра*(?)*шукаць, ра*(?)*жаваць, **ра*(?)*маляваць**, ра*(?)*долле, ра*(?)*крой, ра*(?)*вага, ра*(?)*мова, ра*(?)*вязаць, ра*(?)*гарнуць, ра*(?)*злаваць, ра*(?)*кінуць.

Да выдзеленага дзеяслова падбярыце аднакаранёвыя словы. Запішыце іх, вызначце корань.

Пры вымаўленні свісцячыя гукі [з] і [с] у прыстаўках на зычны прыпадабняюцца да шыпячых у корані слова і разам з імі вымаўляюцца, як [ж̅], [ш̅], [шч]. На пісьме такое вымаўленне не перадаецца: **[ж̅]***аць* — ***зжаць***, **[ш̅]***ыць* — ***сшыць***, *ра***[шч]***асаць* — ***расчасаць***.

Перад мяккімі зычнымі кораня ў прыстаўках на зычны вымаўляюцца гукі [з'] і [с'], што таксама не перадаецца на пісьме: **[уз']***лесак* — ***узлесак***, **[с']***церці* — ***сцерці***, **[б'эз']***зямельны* — ***беззямельны***.

**102.** Размяркуйце прапанаваныя словы па графах табліцы. Падбярыце да яе загаловак.

| Напісанне ***з*** і ***с*** супадае з вымаўленнем | Пішацца ***зз*** і ***сс***, вымаўляецца [з̅'], [с̅'] | Пішацца ***зж, сч, сш***, вымаўляецца [ж̅], [ш̅], [шч] |
|---|---|---|
| | | |

Разбор, усчынаць, ззаду, успомніць, ззелянець, беззямелле, зжаўцець, рассмяяцца, сшытак.



Правообладатель Национальный институт образования

**103.** Прачытайце тэкст. Якія словы пацвярджаюць думку, што бор — гэта сям'я? Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

З аднаго берага ракі на другі заляцела некалькі бе..клапотных хваёвых семачак. З іх выраслі маленькія хвойкі.

Ішлі гады. Маладыя хвоі па..няліся высока ў неба. Вось ужо іх насенне па..хапіў вецер. Яно ўпала на беразе і дало свае ў..ходы. Паступова і гэтыя маленькія[ф] хвойкі па..расні і падарылі свету сваіх дзетак. Так за шмат гадоў на беразе ракі ра..кінуўся вялікі бор.

А што адбылося са старымі хвоямі? Ніжнія галіны па..сохлі трохі, але дрэвы не ..трацілі сваёй прыгажосці[с]. Маладыя дрэвы шчыльнай сцяной а..ступілі сваіх бацькоў, каб засланіць іх ад моцных вятроў *(Паводле Т. Дамаронак)*.

Выпішыце з тэксту словы з прапушчанымі літарамі, растлумачце іх напісанне.

Знайдзіце ў тэксце і выпішыце апорныя словы. Вусна перакажыце тэкст па апорных словах.

**104.** Выканайце тэставую работу па тэме «Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны».

## § 17. Правапіс *і, й, ы* пасля прыставак

**105.** Разгледзьце малюнкі. Выкарыстоўваючы словы для даведкі, складзіце апавяданне па малюнках.







Правообладатель Национальный институт образования